# асвета

дайджэст
па пытаннях адукацыі і навукі

**ВЫПУСК 20 / ЛІСТАПАД 2023**

- МІЖНАРОДНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ
- ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ І АДУКАЦЫЯ
- РЭПРЭСІІ
- ПАЛІТЫКА РЭЖЫМУ

Дасылайце, калі ласка, інфармацыю пра ўсё, што тычыцца адукацыі ў Беларусі, у наш бясьпечны і ананімны чат-бот у тэлеграм: **@eduOST_bot**.

Паведамляйце нам навіны са сваёй установы адукацыі ці дзяржаўнага ведамства датычна рэпрэсій і розных формаў ціску з боку кіраўніцтва, пішыце нам пра факты карупцыі і новыя распараджэнні, якія здаюцца вам неабгрунтаванымі ці нерацыянальнымі.

Таксама запрашаем вас дзяліцца сваімі ідэямі і прапановамі па рэфармаванні сістэмы адукацыі.

АСВЕТА сайт — **тут**
АСВЕТА ў facebook — **тут**
АСВЕТА ў Instagram — **тут**

• НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**Стыпендыя факультэта славянскіх моваў і літаратуры ўніверсітэта Таронта**.

Кафедра славянскіх моваў і літаратуры прымае заяўкі на магістарскія і доктарскія праграмы на восень 2024 года. Абедзве праграмы пакрываюць плату за навучанне і даюць стыпендыю на пражыванне.

Прыём заявак — **да 12 студзеня 2024 года**
Падрабязнасці **па спасылцы**

**Стажыроўка ў Max Planck Institute for Infection Biology**

Інстытут прапануе трохмесячныя стажыроўкі са жніўня па кастрычнік 2024 для замежных студэнтаў бакалаўрыяту і магістратуры. Памер стыпендыі: 1300 эўра, што пакрывае выдаткі на пражыванне ў Берліне. Акрамя таго стыпендыя забяспечвае кампенсацыю транспартных выдаткаў і пражыванне побач з інстытутам. На стажыроўку могуць разлічваць студэнты бакалаўрыяту і магістратуры па такіх напрамках, як біялогія, медыцына, біяхімія, эпідэміялогія або сумежныя дысцыпліны. Для заяўкі неабходна падаць матывацыйны ліст, рэзюмэ, рэкамендацыю, дакументы аб адукацыі.

Прыём заявак — **да 26 лістапада 2023 года**
Больш падрабязна **пра стажыроўку**

**Рэзідэнцыя Akademie Schloss Solitude**

Адна з найбуйнейшых рэзідэнцый Еўропы аб’яўляе набор на новую праграму для маладых вучоных і мастакоў. Рэзідэнцыя адбудзецца ў Штутгарце (Германія). Памер штомесячнай стыпендыі — 1200 еўра, таксама даецца бясплатнае пражыванне і магчымасць працаваць у студыі, пакрыццё выдаткаў на транспарт, медыцынскую страхоўку і працоўныя матэрыялы/інструменты. Мовы рэзідэнцыі: англійская, нямецкая, французская. Працягласць — 6, 9 ці 12 месяцаў, рэалізацыя — у 2024–2026 гадах. Адміністрацыйны збор пры падачы заяўкі — 15 еўра (для ўдзельнікаў з Беларусі).

Дэдлайн першага раунда падачы — **30 лістапада 2023 года**
Усе падрабязнасці **па спасылцы**
Запоўніць анлайн-**заяўку**

**Стыпендыя Фонду Абамы**

на праходжанне стажыроўкі ў Калумбійскім універсітэце, ЗША. Дадзеная праграма адрасавана перспектыўным лідарам і лідаркам з усяго свету, якія дэманструюць прыхільнасць да вырашэння праблем у сваіх супольнасцях і краінах. Працягласць — 9 месяцаў. Стажоры пройдуць цалкам фінанасаваную

рэзідэнцыю ў кампусе Columbia World Projects, паглыбляючы свае веды і навыкі, а таксама ствараючы новыя магчымасці і наладжваючы кантакты для свайго ўздзеяння. Стыпендыя пакрывае кошт навучання, транспартныя выдаткі, штомесячную стыпендыю, пражыванне, медыцынскую страхоўку. Для падачы заяўкі неабходныя: матывацыйны ліст, рэзюмэ, відэапрэзентацыя, моўны сертыфікат, 2 рэкамендацыі.

Прыём заявак — **да 12 снежня 2023 года**
Падрабязней **пра стыпендыю**

**Стыпендыі для беларускіх выкладчыкаў, вучоных і аспірантаў у межах праграмы EU4Belarus – SALT**

Праграма дае магчымасць працягваць акадэмічную і/або педагагічную дзейнасць, павышаць узровень сваіх ведаў, наладжваць прафесійныя кантакты ў краінах ЕС. Гэта прамая падтрымка беларускіх заяўнікаў, якія жывуць у Беларусі альбо былі вымушаныя пераехаць з Беларусі ў ЕС праз палітычны крызіс у Беларусі, а таксама садзейнічанне акадэмічнай мабільнасці беларускіх выкладчыкаў, даследчыкаў, вучоных і аспірантаў. Заяўкі на ўдзел у конкурсе могуць быць пададзеныя па ўсіх абласцях навукі. Працягласць стажыроўкі — ад да 3 да 9 месяцаў.

Прыём заявак: **да 15 снежня 2023 года**
**Падрабязнасці**

**Праграма Master of Arts in European Interdisciplinary Studies**

Даступная ў тым ліку для беларусаў. Міждысцыплінарная праграма дае ўдзельнікам унікальны досвед вывучэння ўнутраных і знешніх працэсаў ЕС, а таксама найважнейшых пытанняў XXI стагоддзя: геастратэгія, кліматычны і энергетычны пераход, медыя і лічбавыя трансфармацыі. У праграме могуць браць удзел выпускнікі ўніверсітэтаў з акадэмічнай адукацыяй у наступных сферах: права, эканоміка, палітычныя ці сацыяльныя навукі, гісторыя, філасофія, геаграфія, лінгвістыка ці журналістыка, і якія зацікаўленыя ў падыходзе да працэсу еўрапейскай інтэграцыі ў шырокай і міждысцыплінарнай перспектыве. Навучанне будзе праходзіць на базе кампуса Каледжа ў Наталіне (Польшча). Стыпендыі пакрываюць кошт навучання і пражывання ў кампусе.

Прыём заявак — **да 16 студзеня 2024 года**
Падрабязней **пра стыпендыю**

**Магістарскія і аспіранцкія праграмы ў Каледжы Еўропы**

Еўрапейскі каледж адкрыў прыём анлайн-заявак на магістарскія праграмы на 2024-2025 навучальны год. Для студэнтаў з краін Усходняга партнёрства, у тым

ліку грамадзян Беларусі, прадугледжаныя стыпендыі. Магістарскія праграмы: еўрапейская эканоміка, права, палітыка і кіраванне, міжнародныя адносіны і дыпламатыя ЕС. Рэалізуюцца на базе кампусаў у Бруге (Бельгія), Наталіне (Польшча) і ў Тыране (Албанія). Аспіранцкая праграма “European Interdisciplinary Studies” на 2024/2025 год, рэалізуецца на базе кампуса ў Наталіне.

Прыём заявак — **да 16 студзеня 2024 года**
Падрабязней **пра магістарскія стыпендыі**
Падрабязней пра праграму **для аспірантаў**
Падаць **анлайн-заяўку**

**Стыпендыя The ONISILOS Marie Sklodowska-Curie**

Універсітэт Кіпра запрашае постдактарантаў падаваць заяўкі на пазіцыю даследчыка ў межах даследчай праграмы пад назвай: “ONISILOS — Суфінансаванне перадавых міжнародных, міждысцыплінарных і міжсектаральных даследаванняў ва Універсітэце Кіпра”. Агульная колькасць даступных месцаў — 27. Праграма адкрытая для вядучых даследчыкаў з усяго свету і ў межах канкрэтных міжсектаральных і міждысцыплінарных дысцыплін і тым, якія можна знайсці **тут**.

Прыём заявак — **да 25 студзеня 2024 года**
Кіраўніцтва для **суіскальнікаў** (PDF-файл)
**Пералік дысцыплін**, уключаных у праграму

• ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПРЫЁМ ЗАЯВАК

На **сайце** АСВЕТА апублікаваны агляд 25+ праграм з падачай заявак у лістападзе–снежні 2023 года. **Ён даступны тут**.

**SVIATLANA TSIKHANOUSKAYA SCHOLARSHIP AT MCI**
**Promoting Freedom, Democracy & Good Governance**

Аўстрыйскі ўніверсітэт MCI Management Center Innsbruck запусціў стыпендыяльную праграму пад ганаровым патранажам Святланы Ціханоўскай. Праграма прызначана для беларусаў і грамадзян іншых Усходнееўрапейскіх краін, уцягнутых у актыўнасці, якія прасоўваюць каштоўнасці свабоды, дэмакратыі і добрага кіравання.
Стыпендыя дасць магчымасць на льготнай аснове атрымаць ступень бакалаўра або магістра па наступных напрамках: “Бізнес і менеджмент”, “Прадпрымальніцтва, турызм і адпачынак“, “Біятэхналогіі”, “Бізнес-псіхалогія і менеджмент”, “Экалагічная, тэхналагічная і энергетычная інжынерыя”, “Міжнародны бізнес і права”, “Міжнародны бізнес і менеджмент”, “Міжнародны менеджмент аховы здароўя”, “Менеджмент, камунікацыя і IT”, “Мехатроніка і разумныя тэхналогіі”, “Медыцынскія тэхналогіі”, а таксама MBA “Агульнае

кіраванне”. Прыём заявак адкрыты да 31 сакавіка 2024 года. Падрабязней пра стыпендыю можна прачытаць **у гэтым PDF-файле**

**Ментарская праграма Global Thinkers Forum**

Анлайн-праграмы настаўніцтва “Telemachus” і “Athena” звязваюць падапечных з лідарамі меркаванняў і людзьмі, арыентаванымі на сацыяльнае ўздзеянне. Telemachus — праграма для ўдзельнікаў ва ўзросце 18 да 29 гадоў з усяго свету, Athena — праграма для жанчын старэйшых за 22 гады. Ментарская праграма — гэта магчымасць індывідуальнага развіцця для задавальнення індывідуальных запатрабаванняў у навучанні, развіцці асабістага і прафесійнага патэнцыялу. Працягласць праграмы — 8 месяцаў. Патрабаванні да суіскальнікаў: свабодная англійская, ступень бакалаўра, прафесійны вопыт не менш за 5 гадоў.

Прыём заявак — **да 30 лістапада 2023 года**
Падаць заяўку **анлайн**

**Стажыроўкі ў Max Planck Institute**

Праграма стажыровак прапануе магчымасць азнаёміцца з даследчымі і акадэмічнымі юрыдычнымі навыкамі ў асноўных сферах параўнальнага публічнага, еўрапейскага і міжнароднага права. Працягласць стажыровак — ад 4 да 12 тыдняў. Даступная студэнтам бакалаўрыяту і магістратуры па напрамках юрыспрудэнцыя, міжнародныя адносіны, філасофія, сацыяльныя і палітычныя навукі. Прадугледжаная стыпендыя ў памеры 300 еўра. Неабходна прадаставіць моўны сертыфікат (англійская C1, веданне нямецкай будзе перавагай), дакументы аб адукацыі і матывацыйны ліст.

Падача заявак на перыяд травень–кастрычнік 2024 — **да 1 снежня 2023 года**
на перыяд лістапад 2024 – красавік 2025 — **да 1 чэрвеня 2024 года**
**падрабязныя ўмовы**

**Магістратура ў Дэлфцкім тэхнічным універсітэце**

стыпендыя Юстуса і Луіза ван Эфен для замежных студэнтаў, якая пакрывае выдаткі на навучанне па адной з магістарскіх праграм універсітэта на працягу аднаго навучальнага года. Для атрымання стыпендыі трэба мець ступень бакалаўра, высокія балы і запрашэнне на магістарскую праграму ад Дэлфцкага ўніверсітэта. Акрамя гэтага неабходны матывацыйны ліст, 2 рэкамендацыі, моўны сертыфікат.

Прыём заявак — **да 1 снежня 2023 года**
Падрабязнасці па **спасылцы**

**Праграма Gates Cambridge**

дадзеная стыпендыя адна з самых прэстыжных у свеце і пакрывае выдаткі на паслядыпломную адукацыю ў Кембрыджскім універсітэце. Распаўсюджваецца на навучанне па любой з праграм універсітэта. Для атрымання стыпендыі

неабходна падаць дакументы па адукацыі, эсэ, рэкамендацыю, план даследавання (для PhD). У выпадку станоўчага рашэння ўдзельніку праграмы кампенсуецца кошт навучання, прадастаўляецца стыпендыя 20000 фунтаў на год на пражыванне, кампенсуюцца транспартныя выдаткі.

Прыём заявак **да 5 снежня** ці **4 студзеня** (у залежнасці ад спецыяльнасці)
**як падаць заяўку і крытэры адбору**

**Стыпендыя Radboud University**

Магчымасць атрымаць ступень магістра і стаць членам акадэмічнай супольнасці для студэнтаў краін, якія не ўваходзяць у ЕС/ЕЭС. Фінансаванне ў межах стыпендыі пакрывае выдаткі на аплату навучання, пражывання, медыцынскай страхоўкі і візавых расходаў. Для падачы неабходны матывацыйны ліст, рэзюмэ, 2 рэкамендацыйныя лісты, моўны сертыфікат.

Прыём заявак — **да 31 студзеня 2024 года**
Падаць заяўку **анлайн**

**Школа культурнай антрапалогіі і гуманітарных навук на Мальце**

Летняя палявая школа арыентавана на маладых антраполагаў і культуролагаў, накіраваных на развіццё ўласных даследчых праектаў. Праграма будзе карысная як для спецыялістаў-пачаткоўцаў, так і для дасведчаных даследнікаў і аспірантаў. Кошт праграмы — 3550 еўра, прадугледжаны шэраг зніжак і **стыпендый**. Колькасць месцаў абмежаваная.

Падрабязней **пра праграму**
Падаць **заяўку анлайн**

• ДАПАМОГА ПАЛІТЗАКЛЮЧАНЫМ

**Офіс па адукацыі для новай Беларусі**

прымае заяўкі на кампенсацыю расходаў ад былых палітзняволеных студэнтаў_ак/вучняў_ніц з Беларусі, якія маюць патрэбу ў фінансавай дапамозе. Якія выдаткі могуць быць кампенсаваныя ў межах праграмы: набыццё тэхнікі для штодзённага выкарыстання і вучобы, кароткатэрміновая арэнда жылля ў краіне навучання, аплата медыцынскіх паслуг, у тым ліку псіхатэрапію, не прадугледжаных іншымі праграмамі, ды інш. Ініцыятыва рэалізуецца ў межах праграмы Orange Scholarships Каралеўства Нідэрландаў.

**падаць заяўку**

**Еўрапейскі Саюз у рамках праграмы “EU4Belarus — SALT-II”**

(Support for Advanced learning and training) абвяшчае прыём заявак на атрыманне фінансавай падтрымкі ў памеры да 1450 еўра на вывучэнне адной з еўрапейскіх моў (на выбар суіскальніка) і здачы па ім іспыту. Праграма прызначана для беларускіх студэнтаў-палітвязняў.

**умовы праграмы і падача заяўкі**

25 лістапада ў Варшаве адбудзецца гібрыднае мерапрыемства (афлайн + анлайн) аб адукацыйных магчымасцях для беларусаў у ЕС. Як паступіць у замежную ВНУ, знайсці фінансавую падтрымку для навучання ў ЕС, пабудаваць прафесійную кар’еру ці стаць валанцёрам у Еўропе? Як абраць траекторыю вучобы ці пабудаваць кар’еру? Дата правядзення: 25 лістапада. Удзельнікі і эксперты: праекты EU4Belarus, EU4Youth і Social Camp; Каледж Еўропы, Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт і Вольны беларускі ўніверсітэт; а таксама adu.place і Паслы еўрапейскай моладзі. Зарэгістравацца на імпрэзу можна **тут**.

На сайце Банка Ідэй апублікаваныя матэрыялы даследавання “Сучасныя тэндэнцыі ў распрацоўцы стратэгій Навучання Цягам Усяго Жыцця: агляд і агульныя прынцыпы”. Канцэпцыя навучання цягам ўсяго жыцця (НЦУЖ) стала папулярнай у пачатку 1970-х гадоў. Якія новыя сэнсы і ідэі ўключае стратэгія НЦУЖ сёння, і як яе могуць прымяніць беларусы — пра гэта і не толькі **чытайце ў канспекце** даследавання на сайце Банка Ідэй.

Праект “Васьміног” прадставіў грунтоўнае даследаванне стану беларускай адукацыі пасля 2020 года. Якія тэндэнцыі выяўленыя, на што ёсць запыт сёння, як адбываецца мілітарызацыя і ідэалагізацыя беларускай адукацыі — кароткі агляд даследавання можна **прачытаць тут**.

Філолаг Ірына Казачэнка **стварыла анлайн-курс** па арфаграфіі беларускай мовы для ўсіх, хто рыхтуецца да цэнтралізаванага іспыту. Гэты курс могуць прайсці і тыя, хто проста хоча праверыць свае веды. На платформе таксама даступна мноства навучальных відэа, якія будуць карысныя і дзецям, і дарослым.

Гісторык і даследчыца Таццяна Астроўская атрымала прэмію Францыска Багушэвіча за манаграфію “Культура і супраціў. Інтэлігенцыя, іншадумства і самвыдат у савецкай Беларусі (1968–1988)”. Беларускі ПЭН-цэнтр уручае гэтую прэмію штогод, пачынаючы з 1995 года, за выбітную гістарычную прозу, якая садзейнічае абуджэнню гістарычнай свядомасці і нацыянальнай незалежнасці чытачоў. Сайт BUDZMA апублікаваў вялікае інтэрв’ю з Таццянай, прачытаць якое **можна тут**.

OSUN Science Shop у Еўрапейскім гуманітарным універсітэце (Вільня, Літва) адкрывае **праграму супрацоўніцтва** на сезон 2023/2024. Прымаюцца заяўкі ад грамадскіх і культурніцкіх арганізацый на сумесныя праекты са студэнтамі і выкладчыкамі ЕГУ. Праекты могуць быць рэалізаваныя ў межах навучальных курсаў і дыпломных работ ва ўніверсітэце, а таксама як навучальныя практыкі ці стажыроўкі. Мэта ініцыятывы — дапамагчы розным арганізацыям знаходзіць рашэнні з улікам іх рэальных патрэбаў і запытаў. Больш падрабязная інфармацыя і форма заяўкі **даступны тут**.

На YouTube-канале кандыдата гістарычных навук Яўгена Красуліна **апублікаваны курс** лекцый “Дыктатура ў тэорыі і на практыцы”. Курс складаецца з 9 відэа, у якіх эксперт закранае як базавыя пытанні (сутнасць тэрміна “дыктатура” і тыпы дыктатур), так і вузейшыя тэмы: ці магчымая “добрая дыктатура”, якія наступствы для грамадства нясе дыктатура і іншыя. У цыкл лекцый таксама ўключаны аналіз дыктатарскіх рэжымаў Лацінскай Амерыкі XIX-XX стагоддзяў.

Выкладчык Сяргей Альшэўскі **даў інтэрв’ю** YouTube-каналу “Беларуская мара”. Ці дастаткова адзін раз адвучыцца і атрымаць адну прафесію на ўсё жыццё, што такое “вольны ўніверсітэт”, што не так з уступнымі кампаніямі ва ўніверсітэты і чаму размеркаванне студэнтаў-выпускнікоў усё ж павінна застацца?

Праект **Students4student** (створаны пры ўдзеле актывістаў Вольнага прафсаюза Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта) апублікаваў статыстыку па затрыманых студэнтах і студэнтках. Паводле гэтых звестак, па стане на пачатак лістапада 2023 года сама меней 77 студэнтаў і навучэнцаў розных навучальных устаноў адбываюць пакаранне ў Беларусі. 54 з іх знаходзяцца ў турмах, 49 — прызнаныя экстрэмістамі, 9 — тэрарыстамі.

31 кастрычніка суд Фрунзенскага раёна горада Мінска **вынес прысуд** дацэнту кафедры беларускай і рускай моваў БДУФК (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры) Наталлі Сівіцкай і кандыдату філалагічных навук, выкладчыцы Надзеі Старавойтавай, а таксама загадчыцы студэнцкага інтэрната Алене Драбудзька. Іх абвінавацілі ва ўдзеле ў акцыях пратэсту ў 2020 годзе і падпісцы на “дэструктыўныя” каналы. Справу разглядала суддзя Алена Бушава. Наталля Сівіцкая і Надзея Старавойтава прыгавораныя да 3 гадоў “хатняй хіміі”, Алена Драбудзька — да 2,5 гадоў “хатняй хіміі”.

13 лістапада стала вядома **пра затрыманне** выпускніка гістфака і ягонай дзяўчыны за тое, што перасылалі адно аднаму навіны з “экстрэмісцкіх” тэлеграм-каналаў. Затрыманыя — 24-гадовы выпускнік гістфака БДУ Мікіта Сіўкоў і 22-гадовая Марына Васілёнак (раней выкладала ангельскую мову). Мяркуючы з інфармацыі з канала сілавікоў, абаім пагражаюць адміністрацыйныя справы.

23 кастрычніка Лідскі раённы суд **прызнаў “экстрэмісцкім”** тэлеграм-канал Беларускай бібліятэкі і музея імя Францыска Скарыны ў Лондане, а таксама яго лагатып. Бібліятэка была заснаваная ў 1971 годзе, і гэта адзіная бібліятэка па-за межамі Беларусі, якая спецыялізуецца выключна на беларускай тэматыцы. Яе збор налічвае больш за 30 000 тамоў, уключна з матэрыяламі перыяду Беларускай Народнай Рэспублікі (1918 год), архівы беларускіх арганізацый і дзеячаў у выгнанні.

7 лістапада ў Беларусі адзначаюць Дзень кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. Напярэдадні “свята” ў школах і ВНУ прайшла серыя ідэалагічных мерапрыемстваў з прасавецкай прапагандай. Як **паведамляе сайт** motolko.help, такія мерапрыемствы прайшлі ў навучальных установах Брэста, Гродна, Гомеля, Лоева, Ляхавіч, Мінска, Мазыра і ў іншых гарадах. Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце і Магілёўскім агралесатэхнічным каледжы адбыліся ўрачыстыя лінейкі, навучэнцы і супрацоўнікі Мазырскага музычнага каледжа наведалі тэматычны канцэрт. Усе мерапрыемствы былі афармленыя вялікай колькасцю савецкай сімволікі, сцягамі і плакатамі.

Міністэрства адукацыі і Генеральная пракуратура **выпусцілі** школьныя падручнікі “Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны”. 16 лістапада адбылася іх прэзентацыя. У падручніках расказваюць пра “карныя аперацыі нацыстаў, лагеры смерці, якія дзейнічалі на тэрыторыі БССР, дзейнасць калабарацыянісцкіх фарміраванняў, а таксама пра подзвіг і гераізм беларускага народа, уключаючы дзяцей, якія аддалі жыццё за нашу свабоду і незалежнасць”. Кнігі выдадзеныя ў трох варыянтах — для 1-4, 5-9 і 10-11 класаў.

**Як стала вядома**, ініцыятарам выключэння рамана Уладзіміра Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім” са школьнай праграмы стаў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім Гігін. Да гэтага года твор вывучалі ўсе адзінаццацікласнікі. У ім расказваецца пра час перад паўстаннем 1863 года, а сярод гістарычных персанажаў згадваюцца Кастусь Каліноўскі і Тарас Шаўчэнка. На думку Гігіна, у рамане “шмат выдуманага, розныя гістарычныя персанажы паказаныя ва ўспрыманні нашага выдатнага пісьменніка, але не так, як яны паўстаюць з гістарычных дакументаў”. Беларускае медыя Plan B звярнулася па каментар да літаратурнага крытыка. Чаму, на яго думку, Гігін не разбіраецца ў літаратуры, а выключэнне рамана са школьнай праграмы — ганьба? Чытайце аб гэтым у **поўнай версіі тэксту**.

Міністр адукацыі Андрэй Іванец **заявіў**, што ў прамысловым сектары беларускай эканомікі занята трэць моладзі краіны (больш за 560 000 чалавек). Чыноўнік адзначыў, што дзяржава сур’ёзна падыходзіць да пытанняў рэалізацыі “дзяржаўнай моладзевай палітыкі сярод навучэнцаў”, а таксама адзначыў, што “менавіта працоўная моладзь з’яўляецца важным суб’ектам рэалізацыі нашых дзяржаўных падыходаў”.

Лукашэнка падпісаў папраўкі ў закон аб ахове здароўя. Згодна з дакументам, урачам, якія паступаюць у ардынатуру, цяпер неабходна будзе адпрацоўваць пасля навучання не менш як пяць гадоў (да прыняцця паправак — два гады) або, у выпадку адмовы, кампенсаваць поўны кошт вучобы. Міністр аховы здароўя Дзмітры Піневіч **заявіў**, што гэта справядлівае рашэнне і адзначыў, што атрымліваць некаторыя спецыялізацыі зараз можна будзе толькі праз ардынатуру. Што пра медыцынскую адукацыю і будучыню для ўрачоў думаюць самі медыкі — можна **прачытаць тут**.

Міністэрства адукацыі Беларусі **плануе пашырыць** пералік спецыяльнасцяў у вышэйшых навучальных установах, куды пераможцы ўніверсітэцкіх алімпіяд сярод 11-класнікаў змогуць паступаць без экзаменаў. Спіс яшчэ не зацверджаны, але вядома, што ў яго плануюць уключыць шэраг педагагічных і IT-спецыяльнасцяў.

Услед за школьнікамі і навучэнцамі сярэдніх спецыяльных навучальных установ, студэнтаў універсітэтаў абавязалі наведваць прагляды дакументальнага фільма пра супрацоўніка КДБ, які загінуў пры штурме кватэры Андрэя Зельцэра. Прагляды арганізаваныя з мэтай “патрыятычнага выхавання навучэнцаў і фарміравання грамадзянскай пазіцыі”. **Згодна з метадычкай** Міністэрства адукацыі, пасля прагляду неабходна правесці абмеркаванне фільма, паразважаць пра тое, ці ёсць розніца паміж гераізмам у мірны і ў ваенны час, абмеркаваць учынак супрацоўніка КДБ.

**Дзякуем за ўвагу!**

**Звязацца з намі:**

ананімны чат-бот у тэлеграм: @eduOST_bot
e-mail: education@tsikhanouskaya.org